# ІП ці фірма?

## Топ-5 сфераў дзейнасці для ІП

1 Гандаль, рамонт аўтамабіляў і матацыклаў

2 Транспарт, складаванне, паштовая і кур'ерская дзейнасць

3 Прафесійная навуковая і тэхнічная дзейнасць

4 Будаўніцтва

5 Прамысловасць

*па дадзеных Белстата



### ПРАДПРЫМАЛЬНІК

**ПЛЮСЫ**

- ТАННАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ
- НЕ ПАТРЭБНА ПАМЯШКАННЕ ДЛЯ ЮРЫДЫЧНАГА АДРАСА
- НЕ ПАТРЭБНЫ ЎСТАЎНЫ ФОНД
- МОЖА САМАСТОЙНА ВЕСЦІ БУХГАЛТАРСКІ ЎЛІК
- МОЖНА ВОЛЬНА АБЫХОДЗІЦЦА З СРОДКАМІ, АТРЫМАНЫМІ АД ДЗЕЙНАСЦІ

**МІНУСЫ**

- НЕ БОЛЬШ ЗА ТРЫ ЧАЛАВЕКІ НАЁМНЫХ РАБОТНІКАЎ
- АДКАЗВАЕ ЗА ДЗЕЙНАСЦЬ УСЕЙ СВАЁЙ МАЁМАСЦЮ



### ФІРМА

**ПЛЮСЫ**

- ТАННАЯ РЭГІСТРАЦЫЯ
- НЕ АДКАЗВАЕ ПА АБАВЯЗАННЯХ ЮРЫДЫЧНАЙ АСОБЫ СВАЁЙ МАЁМАСЦЮ (АКРАМЯ ТДА)

**МІНУСЫ**

- ПАТРЭБНЫ ЎСТАЎНЫ ФОНД
- ПАТРЭБНЫ ГАЛОЎНЫ БУХГАЛТАР
- АБМЕЖАВАННІ Ў КОЛЬКАСЦІ РАБОТНІКАЎ ПРЫ ПРАЦЫ ПАВОДЛЕ СПРОШЧАНАЙ СІСТЭМЫ ПАДАТКААБКЛАДАННЯ

## Топ-5 найбольш прыбытковых сфераў*

**56,9** Аперацыі з нерухомаю маёмасцю

**28,5** Забеспячэнне электраэнергіяй, газам, парай, гарачай вадой і кандыцыяваным паветрам

**27,3** Інфармацыя і сувязь

**19,5** Прафесійная, навуковая і тэхнічная дзейнасць

**13,1** Дзейнасць у сферы адміністрацыйных і дапаможных паслуг

*% рэнтабельнасці для сярэдніх, малых і мікраарганізацый у 2018 г.

*па дадзеных Белстата

# Паслугі без рэгістрацыі

**Існуе 30 прафесіяў, прадстаўнікі якіх могуць працаваць без рэгістрацыі ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Такія людзі называюцца самазанятымі. Каб стаць самазанятым, трэба падаць у падатковую службу апавяшчэнне і сплаціць адзіны падатак, памер якога залежыць ад паселішча. І можна працаваць на сябе.**



Продаж кветак · Паслугі цырульнікаў і касметолагаў · Рэпетытарства · Распрацоўванне вэб-сайтаў, рамонт ПК · Рамонт і вытворчасць адзення/абутку · Дызайн інтэр'ераў, графічны дызайн · Тынкавальныя і малярныя працы · Паслугі фотаздымання · Паслугі сядзелак і нянек

# Дзе пачынаць бізнес?



**Сярэднія і малыя мясцовасці**

Вызваленыя ад падатку на прыбытак ад уласнай вытворчасці, падатку на нерухомасць, платы за ліцэнзіі (Дэкрэт № 6).



**Паўднёва-ўсходні рэгіён Магілёўскай вобласці**

Ільготы па ўнёсках у ФСАН, падаходным падатку, у фінансаванні выдаткаў на стварэнне інжынернай і транспартавай інфраструктуры ды г. д.



**Аршанскі раён**

Меншыя ўнёскі ў ФСАН і падаходны падатак, зменшана стаўка падатку, вызваленне ад ПДВ пры ўвозе тэхналагічнага абсталявання, мараторый на правядзенне праверанняў.



**Міхал Залескі**
эканаміст, эксперт тэлепраграмы «Асабісты капітал»

**Навошта бізнесоўцам-пачаткоўцам пісаць бізнес-план?**

Прарок Мухамэд казаў у такіх выпадках: «Калі вы такія разумныя, то чаму смяротныя? Маглі б і вечна жыць». Параўнальнай статыстыкі эфектыўнасці мікрапраектаў з планам і без яго ніхто не рабіў, але нават міні-праекты, ад 1000 рублёў, без планаў нікім не крэдытуюцца. Калі выбіраеш, ці праца ці бізнес, спачатку сядзь ды распішы не толькі магчымыя даходы і выдаткі, але і колькі часу будзе займаць работа на сябе. Так зразумееш, колькі каштуе твая праца і што табе выгадней.